СВЯТЛАНА ЦІХАНОЎСКАЯ ОФІС | Офіс Дэмакратычных Сіл Беларусі Чэская Рэспубліка | Аб'яднаны Пераходны Кабінет Беларусі | НАРОДНЫЯ АМБАСАДЫ БЕЛАРУСІ | Каардынацыйная рада | FRIEDRICH NAUMANN FOUNDATION For Freedom. Central Europe and the Baltic States

# КАНФЕРЭНЦЫЯ БЕЛАРУСАЎ(-АК) СВЕТУ III

23/03–24/03—2024

Прага



Панэль №1. Стратэгічнае бачанне беларускай дэмакратычнай супольнасці і роля беларусаў (-ак) за мяжой на 2024-2025 гады — 03

Панэль №2. Роля беларусаў (-ак) за мяжой у беларуска-ўкраінскіх адносінах — 04

Панэль №3. Умацаванне патэнцыялу супольнасці беларусаў (-ак) за мяжой — 07
I. А. Дапамога палітычным зняволеным і іх сем'ям/сваякам — 07
II. Б. Легалізацыя і дакументы — 08
III. В. Культура і нацыянальнае адраджэнне — 09
IV. Г. Рэсурсы і фінансаванне — 10

Дадатковыя матэрыялы і прэзентацыі — 11






# Панэль №1. Стратэгічнае бачанне беларускай дэмакратычнай супольнасці і роля беларусаў (-ак) за мяжой на 2024-2025 гады

Спікеры і спікеркі:
- Павел Латушка. Намеснік кіраўніка Аб'яднанага пераходнага кабінета, кіраўнік Нацыянальнага антыкрызіснага ўпраўлення
- Франак Вячорка. Галоўны дарадца Святланы Ціханоўскай
- Аляксандра Мамаева. Каардынатарка Народных амбасад Беларусі
- Роза Турарбекава. Член Міжнароднай камісіі Каардынацыйнай рады, кандыдат гістарычных навук, дацэнт
- Павел Кухта. Кіраўнік мабілізацыйнага цэнтру Палка Кастуся Каліноўскага

**Асноўныя тэзы выступоўцаў**
Намеснік кіраўніцы Кабінета і кіраўнік НАУ **Павел Латушка** заклікаў да ўмацавання легітымнасці Святланы Ціханоўскай, Кабінета і Каардынацыйнай рады. Ён падтрымаў намаганні па адвакатаванні правоў беларусаў за мяжой, але, з іншага боку, адзначыў неабходнасць вылучэння вялікіх рэсурсаў на ўнутраную палітыку. Такім чынам, ён прапанаваў **прызначыць прадстаўніка па ўнутранай палітыцы і па эканоміцы і фінансах**, каб знізіць знешнюю залежнасць і стварыць беларускую эканоміку за мяжой. Гаворачы аб выбарах у Каардынацыйную раду, Латушка заклікаў правесці іх адначасова з выбарамі ў ЕС.

Галоўны дарадца Святланы Ціханоўскай **Франак Вячорка** таксама падкрэсліў неабходнасць узмацнення суб'ектнасці беларусаў за мяжой, у т.л. шляхам актыўнага ўдзелу ў міжнародных форумах і мерапрыемствах. У гэтым кантэксце ён заклікаў да правядзення выбараў у Каардынацыйную раду ў канцы лета. Такое рашэнне, на думку дарадцы, дазволіць мабілізаваць беларусаў на эміграцыі напярэдадні 2025 года, калі ў Беларусі чакаюцца прэзідэнцкія выбары.

Для падтрымкі дэмакратычных зменаў Вячорка заклікаў да ўсталявання гарызантальных сувязяў паміж даўнімі і новымі эмігрантамі. Ён таксама адзначыў важнасць **прыцягнення прыватнага сектара да падтрымкі палітычных структураў і кампаніяў**, бо прыватны сектар быў адным з драйвераў кампаній салідарнасці ў 2020-2021 гг.

Каардынатарка Народных амбасад **Аляксандра Мамаева** сфармулявала тры асноўныя напрамкі дзейнасці для беларускай дыяспары:
- Дапамога суайчыннікам унутры і за межамі Беларусі.
- Захаванне і развіццё беларускай культуры.
- Умацаванне структураў для гатоўнасці да розных сцэнароў змен у палітычнай сітуацыі ў Беларусі.

Мамаева заклікала да **стварэння сеткі беларускіх дамоў у розных краінах** як пляцовак для сустрэчаў дыяспары і правядзення тэматычных мерапрыемстваў.

Палітолаг і член Міжнароднай камісіі КР **Роза Турарбекава** папярэдзіла аб **надыходзячым моцным ціску на беларусаў за мяжой у 2025 годзе.** Яна адзначыла такія праблемы, як адмова рэжыму ад консульскай дапамогі беларусам, фінансавыя і псіхалагічныя выклікі эміграцыі, а



таксама негатыўны міжнародны кантэкст. Для гатоўнасці да новых выклікаў Турарбекава падкрэсліла важнасць прагназавання праблем і гатоўнасць да змяненняў. Акрамя таго, яна падкрэсліла неабходнасць павышэння стрэсаўстойлівасці і накапленне рэсурсаў для адказу на выклікі ўнутранага характару і пагрозы з боку рэжыму. Неабходнасць думаць пазітыўна.

Кіраўнік мабілізацыйнага цэнтра Палка Кастуся Каліноўскага **Павел Кухта** заявіў аб гатоўнасці палітычнага крыла ПКК да дыялогу з усімі ініцыятывамі і сіламі і вылучыў праект Беларускага дрона як адзін з крокаў на гэтым шляху, падкрэсліваючы яго важнасць як для беларусаў, так і для ўкраінцаў.

## Панэль №2. Роля беларусаў (-ак) за мяжой у беларуска-ўкраінскіх адносінах

FRIEDRICH NAUMANN FOUNDATION For Freedom. Central Europe and the Baltic States

Спікеры і спікеркі
- Ігар Кізім. Пасол Украіны па асобых даручэннях па Беларусі
- Таццяна Гацура-Яварская. Рэабілітацыйны цэнтр «Ланка» і кінафестываль «1084. На мяжы» ва Украіне
- Генадзь Манько. Місія дэмакратычнай Беларусі ў Кіеве
- Марыя Анімія. Каардынатарка дапамогі беларускім валанцёрам ва Украіне, фонд BYSOL
- Яўген Магда. Палітычны эксперт, аўтар тэлеграм-канала «Беларуска-ўкраінскі назіральнік»
- Станіслаў Салавей. Беларускі лекар ва Украіне, прафсаюзны актывіст

**Асноўныя тэзы выступоўцаў**
У праграмнай прамове **Ігар Кізім** адзначыў, што стратэгічнай цікавасцю Украіны з'яўляецца дэмакратычная Беларусь з празрыстай палітыкай. Ён дадаў, што ўсё большую пагрозу прадстаўляе Саюзная дзяржава ў сувязі са скарачэннем часу прыняцця рашэнняў у Беларусі. Спікер абазначыў, што, на яго думку, Украіне трэба развіваць адносіны з беларускім грамадствам, большасць якога выступае супраць вайны. Ігар Кізім **заклікаў дэмакратычны рух да адзінства**, т.я. гэта спрасціла б для Украіны перамовы з ім, але заявіў аб гатоўнасці працаваць з рознымі структурамі.

Сваё персанальнае меркаванне ў дачыненні да беларусаў Кізім падзяліў на тры часткі:
- Адным з галоўных саюзнікаў Украіны ён назваў частку беларускага грамадства, якое фармуе дэмакратычныя інстытуты, і абверг паведамленні аб просьбах Украіны скараціць фінансаванне беларускіх дэмсілаў і медыя.
- Ігар Кізім адзначыў, што беларусы ва Украіне, у т.л. Полк Кастуся Каліноўскага і іншыя добраахвотнікі сваёй дзейнасцю выпраўляюць негатыўнае стаўленне да беларусаў. Ён зазначыў, што можа быць карысным існаванне ў ПКК **палітычнай структуры.**
- Спікер выказаў надзею на мудрасць людзей у Беларусі і іх разуменне таго, што расійскай вайне трэба супрацьстаяць. Такое разуменне ён **заклікаў прасоўваць праз медыя і палітычныя кампаніі.**

Кіраўніца цэнтра дапамогі «Ланка» **Таццяна Гацура-Яварская падкрэсліла важнасць дыяспары ў ініцыятывах па зборы грошай.** Таццяна распавяла пра праекты, рэалізаваныя пры

падтрымцы беларусаў у эміграцыі.

- У 2022 годзе беларускай дыяспары ў Італіі ўдалося сабраць больш за 90 тысячаў еўра на 24 VAC-апараты, якія дапамагаюць у лячэнні параненых.
- У т.л. для інфармавання ўкраінскай аўдыторыі быў праведзены кінафестываль «1084. На мяжы».
- У 2023 годзе быў запушчаны рэабілітацыйны цэнтр, які дапамагае як беларускім, так і ўкраінскім салдатам і добраахвотнікам. Сярод партнёраў ініцыятывы ёсць украінскі дзяржаўны медыцынскі цэнтр.

Нягледзячы на такія адзінкавыя партнёрствы з дзяржавай, ва Украіне захоўваецца праблема абмежаванняў супраць беларусаў (-к), якія перашкаджаюць развіццю беларускіх ініцыятываў у краіне. Так, ахвяраванні ад беларусаў (-к) блакуюцца, а грошы, замарожаныя на рахунках прадстаўнікоў дыяспары, таксама маглі б ісці на падтрымку ініцыятываў. **Гацура-Яварская заклікала Украіну перагледзець гэтыя абмежаванні.**

Кіраўнік Місіі дэмакратычнай Беларусі ў Кіеве **Генадзь Манько** адзначыў, што, нягледзячы на фрагментаванасць украінскага палітычнага поля, да пачатку вайны грамадства было адзінае ў падтрымцы беларускага народа. З пачаткам вайны стаўленне да беларусаў стала рэзка негатыўным, але пасля стала мяняцца – у першую чаргу дзякуючы добраахвотнікам. Манько падкрэсліў, што беларусы – самая вялікая арганізаваная замежная група ва ўкраінскіх войсках, і дадаў, што дэмакратычная Беларусь прадставіла дастаткова падтрымкі Украіне ў выглядзе фінансавых ахвяраванняў, мабільных шпіталяў, джыпаў, аўтобусаў, медыцынскіх тавараў, дапамогі для ваенных і інш.

Манько адзначыў **прагрэс у супрацоўніцтве дэмакратычнай Беларусі з Украінай**, якога ўдалося дасягнуць у т.л. дзякуючы створанай у 2020 годзе групе «За дэмакратычную Беларусь» у Вярхоўнай Радзе. Далейшы прагрэс можа быць дасягнуты дзякуючы назначэнню Ігара Кізіма паслом па асобых даручэннях па Беларусі. Спікер падкрэсліў, што **задача дэмсілаў – данесці да ўкраінскіх уладаў, што трэба падзяляць беларусаў і рэжым.** З іншага боку, Манько акрэсліў, што поўнасцю вырашыць гэту задачу магчыма толькі пры ўмове заканчэння вайны.

Прадстаўніца BYSOL **Маша Анімія** заявіла, што з сярэдзіны лета 2023 года фонд у напрамку дапамогі беларускім добраахвотнікам ва Украіне толькі ў персанальных зборах выплаціў на суму 41 133 еўра. Гэтую суму ўдалося сабраць у тым ліку дзякуючы актыўнай падтрымцы беларускай дыяспары.

Анімія адзначыла, што па дапамогу звяртаюцца добраахвотнікі як з Палка Кастуся Каліноўскага, так і з іншых падраздзяленняў (напрыклад, Танга-Рамэа, Волат, 79 Одшб, Другі інтэрнацыянальны легіён). Неананімныя зборы закрываюцца ў сярэднім на 100-120%, ананімныя – на 85-90%. Апроч матэрыяльнай дапамогі, спікерка падкрэсліла **неабходнасць вывазу сем'яў добраахвотнікаў з Беларусі з-за рызыкаў іх бяспекі.**

Яна дадала, што многія добраахвотнікі сыходзяць з УСУ па розных прычынах – з-за жадання аднавіць здароўе, «пачаць новае жыццё» і інш. Сярод праблемаў спікерка адзначыла адсутнасць цэнтралізаванай дапамогі ветэранам вайны. Нягледзячы на намаганні фонду па дапамозе, яна **заклікала дэмсілы лабіраваць больш шырокую падтрымку, у т.л. месцы ў клініках і санаторыях для ветэранаў.** Анімія адзначыла, што такія магчымасці трэба збіраць і даваць пра іх інфармацыю яшчэ ў той перыяд, калі добраахвотнікі знаходзяцца або праходзяць лячэнне ва Украіне, каб можна было планаваць легалізацыю ў ЕС і магчымасці



знаходжання там.

Маша Анімія заклікала прызначыць адказных па рашэнні названых праблемаў і назваць канкрэтныя тэрміны выканання задачаў.

Палітолаг **Яўген Магда** адзначыў, што Украіна і Беларусь завяршаюць працэс фармавання сваіх палітычных нацый, і заклікаў да ўзаемнай павагі і падтрымкі і вывучэння вопыту іншых краін. Ён заявіў, што **беларускай дыяспары патрэбныя наратывы, каб больш эфектыўна ўздзейнічаць на беларусаў унутры краіны ва ўмовах дамінавання рэжымнай і расійскай прапаганды.** Магда таксама заявіў аб неабходнасці сумеснай працы для фармавання наратываў украінскай дыяспары ў Беларусі.

Палітолаг абазначыў, што **эфектыўнай пляцоўкай для камунікацыі паміж Украінай і Беларуссю можа быць узаемадзеянне ў рамках «Балта-Чарнаморскага саюза».** У дзвюх краінаў ёсць агульныя каштоўнасці – быць у цэнтры Еўропы, паважаць адзін аднаго, вырашаць канфлікты мірна. З іншага боку, ёсць рознае бачанне будучыні. Ва Украіне, паводле слоў Магды, 75% людзей падтрымліваюць уступленне ў НАТА і ЕС. У Беларусі сітуацыя іншая, але і ва Украіне, зазначыў Магда, такі паказчык дасягаўся гадамі, а магутным драйверам стаў пачатак вайны. Магда не выключыў разрыву дыпламатычных адносінаў паміж Кіевам і Мінскам у выпадку адкрыцця ў Растове-на-Доне Генеральнага консульства Беларусі, экзэкетура якога будзе распаўсюджвацца на акупаваныя тэрыторыі Украіны.

Медык **Станіслаў Салавей** расказаў, што Украіне патрэбныя ўрачы, а асабліва вострая праблема стаіць на вызваленых тэрыторыях. **Украіна зацікаўленая ў прыцягненні ўрачоў**, ёсць квоты на прыезд замежнікаў.

Пасля 2020 года прынамсі дзясяткі беларускіх лекараў пераехалі ва Украіну. У 2022 годзе сітуацыя змянілася, і многія з іх былі вымушаныя з'ехаць з Украіны. Але частка ўрачоў-беларусаў засталася працаваць ва Украіне: Салавей прывёў у прыклад беларускіх урачоў, якія ўзначальваюць аддзяленні ў вядучых медустановах Украіны і аперуюць вайскоўцаў.

З іншага боку, нягледзячы на зацікаўленасць Украіны ў прыцягненні ўрачоў з-за мяжы, **прыезд урачоў-беларусаў практычна немагчымы.** Была адмененая магчымасць прызнання беларускіх дыпломаў, застаюцца актуальнымі праблемы з легалізацыяй і заблакаванымі банкаўскімі рахункамі. Салавей **заклікаў да вырашэння гэтых праблемаў** і адзначыў, што нават малая колькасць новых урачоў будзе важнай для Украіны.





## Панэль №3. Умацаванне патэнцыялу супольнасці беларусаў (-ак) за мяжой

**I. Дапамога палітычным зняволеным і іх сем'ям/сваякам**

Спікеры і спікеркі

- Вераніка Станкевіч. Актывістка і каардынатарка ініцыятывы «Вольныя»
- Юлія Юхно. Прадстаўніца Народнай амбасады Беларусі ў Італіі
- Вольга Зазулінская. Кіраўніца фонду «Краіна для жыцця» і праваабаронца, каардынатарка праекту дапамогі палітвязням і іх сем'ям
- Андрэй Стрыжак. Кіраўнік фонду салідарнасці BYSOL

**Асноўныя тэзы выступоўцаў**

Актывістка і каардынатарка ініцыятывы «Вольныя» **Вераніка Станкевіч** вылучыла праблему недастатковай падтрымкі для былых палітвязняў. Яна заклікала беларусаў і беларусак дапамагаць па меры сваіх магчымасцяў: палітыкаў – у пытаннях легалізацыі і лабіравання дапамогі, бізнесы – грашыма і рэсурсамі, спецыялістаў – прафесійнымі навыкамі і інш. Яна прывяла ў прыклад працу ініцыятывы па рэсацыялізацыі былых палітвязняў, у рамках якой ім даецца ўсебаковая дапамога.

Прадстаўніца Народнай амбасады Беларусі ў Італіі **Юлія Юхно** расказала пра праграму псіхалагічнага аздараўлення і знаёмства з культурай Італіі для дзяцей 10-15 гадоў са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў як у Беларусі, так і за яе межамі.

Кіраўніца фонду «Краіна для жыцця» **Вольга Зазулінская** расказала пра тое, што вынікам мінулай дыяспаральнай канферэнцыі было напісанне канцэпцыі праекта «Праз культуру да свабоды». Гэты праект не змог рэалізаваць сябе самастойна, але лёг у аснову ідэі праекта Народных Амбасадаў – Міжкантынентальнай эстафеты салідарнасці «Голас праз межы: Міжкантынентальная эстафета ў падтрымку Беларусі». Мэтай праекта міжкантынентальнай эстафеты з'яўляецца прыцягненне ўвагі сусветнай супольнасці і жыхароў кожнай асобнай краіны да праблемаў беларусаў унутры краіны, пошук новых партнёраў па розных напрамках гуманітарнай дапамогі, праз інструмент прэзентацыі беларусаў для ўсяго свету.

Кіраўнік фонду салідарнасці BYSOL **Андрэй Стрыжак** таксама падтрымаў ідэю эстафеты і прэзентаваў стварэнне Службы «Хуткай гуманітарнай дапамогі», у склад якой увайшлі 4 буйныя арганізацыі: BySol, ByHelp, Dissident.by і фонд «Краіна для жыцця». Служба створаная для павышэння якасці і хуткасці дапамогі палітвязням і іх сем'ям, а таксама на больш хуткае рэагаванне на праблематыку і выклікі ўнутры краіны і за яе межамі для мэтавай групы.



## Панэль №3. Умацаванне патэнцыялу супольнасці беларусаў (-ак) за мяжой

**II. Легалізацыя і дакументы**

Спікеры і спікеркі

- Крысціна Шыянок. Дырэктарка Офіса дэмакратычных сілаў Беларусі ў Чэшскай Рэспубліцы, у мінулым – прадстаўніца беларускай меншасці ў Камітэце па справах меншасцяў пры пражскім магістраце, каардынатарка медыка-гуманітарнай праграмы Medevac пад эгідай МУС Чэхіі па дапамозе пацярпелым падчас мірных пратэстаў у Беларусі ў 2020 годзе
- Ганна Маціеўская. Заснавальніца ініцыятывы «Партызанка», кіраўніца ўсходняга аддзела WKB Lawyers, старшыня Назіральнай рады ABBA
- Зміцер Васерман. Прадстаўнік Народнай амбасады Беларусі ў Швецыі
- Валер Кавалеўскі. Намеснік кіраўніцы Аб'яднанага пераходнага кабінета і кіраўнік Прадстаўніцтва па міжнародных справах

**Асноўныя тэзы выступоўцаў**

Дырэктарка Офіса дэмакратычных сілаў Беларусі ў Чэшскай Рэспубліцы **Крысціна Шыянок** падзялілася вопытам вырашэння праблемаў з дакументамі. Яна адзначыла, што многія працэдуры рэгулююцца міждзяржаўнымі пагадненнямі, заключанымі з Беларуссю, дэнансаваць якія не ўяўляецца рэальным, паколькі будуць закранутыя і іншыя сферы (напрыклад, аліменты), але падкрэсліла, **што краіны могуць змяняць правапрымяненне, не мяняючы пры гэтым заканадаўства, прычым часам дастаткова актуалізаваць методыку.** Так, Чэхія, змяніўшы правапрымяненне, часова прыпыніла патрабаванне апастылявання афіцыйных дакументаў з Беларусі, а дзякуючы новай методыцы МУС ЧР стала выдаваць больш альтэрнатыўных дакументаў на замену пашпарта РБ (пашпарт замежнага грамадзяніна з тэрмінам дзеяння да 10 гадоў, альтэрнатыўны праязны дакумент з тэрмінам дзеяння да 180 дзён). Іншыя краіны могуць рушыць услед гэтаму прыкладу.

Заснавальніца ініцыятывы «Партызанка» і кіраўніца ўсходняга аддзела WKB Lawyers **Ганна Маціеўская** падкрэсліла, што ў Польшчы адзін з найбольш спрыяльных прававых рэжымаў для легалізацыі беларусаў. Даступны асобны спосаб легалізацыі – «гуманітарны» ВНЖ, распаўсюджаная выдача альтэрнатыўных дакументаў на замену беларускага пашпарта.

Прадстаўнік Народнай амбасады Беларусі ў Швецыі **Зміцер Васерман** расказаў аб цяжкасцях з атрыманнем прытулку ў Швецыі, якіяназіраліся ў сувязі са слабым разуменнем іміграцыйным ведамствам краіны сітуацыі ў Беларусі. Пасля кейсаў адмовы беларусам у прадастаўленні прытулку Народная амбасада з дапамогай кантактаў у парламенцкай групай сяброў свабоднай Беларусі, МЗС, міністэрствам юстыцыі і медыйнай кампаніі змагло дабіцца сустрэчы ў міграцыйным агенцтве і дабіцца ад іх радыкальнага абнаўлення афіцыйнай даведкі па сітуацыі ў Беларусі, якая больш аб'ектыўна апісвае сітуацыю з рэпрэсіямі.

Таксама Васерман расказаў пра досвед праекта pashpart.org, які быў запушчаны пасля прыняцця рэжымам закона аб адмене консульскіх паслугаў у афіцыйных дыпламатычных місіях Беларусі. Праект накіраваны на інфармаванне беларусаў пра магчымыя альтэрнатывы беларускаму пашпарту. Апроч запуску праекту, Народныя амбасады праінфармавалі ўрады



краінаў пра сітуацыю, каб тыя змянілі правапрымяненне адносна беларусаў.

Кіраўнік Прадстаўніцтва па міжнародных справах Аб'яднанага пераходнага кабінета **Валер Кавалеўскі** расказаў, што для вырашэння праблемаў з легалізацыяй беларусаў і іх мабільнасцю дэмакратычныя сілы працуюць з нацыянальнымі ўрадамі краінаў і Еўрапейскай камісіяй. Ён таксама анансаваў канферэнцыю 6-7 ліпеня ПАРЕ пры падтрымцы парламента Люксембурга і МЗС па пытаннях рэалізацыі рэзалюцыі ПАРЕ краінамі Еўропы па рашэнні праблемаў беларусаў за мяжой.

Кавалеўскі расказаў пра працу над праектам пашпарта Новай Беларусі і заклікаў беларусаў падтрымаць праект. Пашпарт можа стаць працоўнай альтэрнатывай бягучаму беларускаму пашпарту, а зараз вядзецца праца над перапісам людзей, якім патрэбны гэты дакумент, і збор сродкаў на дзейнасць органа па яго выдачы.

## Панэль №3. Умацаванне патэнцыялу супольнасці беларусаў (-ак) за мяжой

**III. Культура і нацыянальнае адраджэнне**

Спікеры і спікеркі

- Павел Баркоўскі. Намеснік прадстаўніцы па нацыянальным адраджэнні Аб'яднанага пераходнага кабінета
- Алесь Лапко. Кіраўнік Моладзевага хаба і прадстаўнік Народнай амбасады Беларусі ў Польшчы
- Надзея Гарэцкая. Намесніца кіраўніка Беларускай Рады культуры (на момант правядзення Канферэнцыі – каардынатарка арганізацыі)

**Асноўныя тэзы выступоўцаў**

Намеснік прадстаўніцы па нацыянальным адраджэнні Аб'яднанага пераходнага кабінета **Павел Баркоўскі** прывёў даныя, што ў 2023 годзе было зафіксавана 1499 парушэнняў правоў культурных дзеячаў у Беларусі. Ён назваў асноўныя праблемы, якія перашкаджаюць развіццю беларускай культуры: рэпрэсіі, прызнанне ініцыятываў і матэрыялаў «экстрэмісцкімі», русіфікацыя адукацыі. Баркоўскі нагадаў, што бягучы год аб'яўлены Годам нацыянальных традыцыяў і прапанаваў шэраг дзеянняў для дыяспары, каб развіваць беларускую культуру на эміграцыі:

- Далучацца да беларускіх школ выхаднога дня, звяртацца да мясцовых уладаў з патрабаваннем адкрыцця школ з навучаннем беларускай мовы.
- Інфармаваць мясцовую публіку пра падзеі ў Беларусі і **ладзіць беларускія мерапрыемствы, а таксама пашыраць сумесныя творчыя праекты.**

Кіраўнік Моладзевага хаба і прадстаўнік Народнай амбасады Беларусі ў Польшчы **Алесь Лапко** падтрымаў ідэю выкарыстання культурных пляцовак для асветніцкіх мерапрыемстваў і заклікаў захоўваць беларускую ідэнтычнасць дыяспары. Ён прапанаваў дапамогу хаба нізавым актывістам і заклікаў да **стварэння пляцовак, якія будуць гадаваць палітычныя і дыпламатычныя кадры**, а таксама праводзіць мясцовыя палітычныя кампаніі.



Намесніца кіраўніка Беларускай Рады культуры **Надзея Гарэцкая** (на момант правядзення Канферэнцыі – каардынатарка арганізацыі) падкрэсліла важнасць захавання адзінага культурнага поля для беларусаў як у Беларусі, так і за мяжой і заклікала да ўсталявання мастоў для культурнага абмену. Як адзначыла спікерка, Рада культуры працуе над такімі ініцыятывамі. Таксама Гарэцкая вылучыла ідэю **ўключэння беларускіх прафесійных аб'яднанняў і інстытутаў у міжнародныя сеткі пры партнёрстве з міжнароднымі інстытутамі, развіцця краўдфандынгу (прыкладам можа быць праект Магістраты культуры) і медыйных кампаніяў.**

## Панэль №3. Умацаванне патэнцыялу супольнасці беларусаў (-ак) за мяжой

**IV. Рэсурсы і фінансаванне**

Спікеры і спікеркі

- Паліна Бродзік. Старшыня Міжнароднай камісіі Каардынацыйнай рады і дырэктарка Free Belarus Center
- Павел Лібер. Сузаснавальнік платформаў «Голас» і «Новая Беларусь»
- Аляўціна Снягір. Каардынатарка праграмы «Фонд дэмакратыі ў Беларусі» Германскага фонду Маршала ЗША

**Асноўныя тэзы выступоўцаў**

Старшыня Міжнароднай камісіі Каардынацыйнай рады і дырэктарка Free Belarus Center **Паліна Бродзік** распавяла пра акселератараў, у межах якіх можна атрымаць фінансаванне для праектаў. Адказваючы на пытанне пра рызыкі памяншэння фінансавання для Беларусі і зняцця прыярытэтаў у бок падтрымкі расійскай апазіцыі, яна заклікала беларусаў (-к) не баяцца адстойваць неабходнасць падтрымкі беларускай грамадзянскай супольнасці, распрацоўваць якасныя новыя праекты, акцэнтуючы ўвагу на неабходнасці дакладнага размежавання беларускіх і расійскіх бюджэтаў у донарскіх арганізацый.

Сузаснавальнік платформаў «Голас» і «Новая Беларусь» Павел Лібер расказаў пра фінансавыя праекты яго каманды. Так, быў запушчаны праект лічбавага самакіравання, а таксама пілот, у межах якога ў Літве і Польшчы можна было ахвяраваць грошы на мясцовыя беларускія ініцыятывы. Таксама Лібер анансаваў праект краўдфандынгу, які плануецца запусціць летам. Ён заклікаў да «стратэгіі маленькіх перамогаў», у рамках якой запускаюцца малыя праекты (прыклад – мясцовая бібліятэка) і генеруюцца стабільныя перамогі. Такая стратэгія можа дапамагчы прыцягнуць больш прыхільнікаў ва ўмовах рэпрэсіяў.

Каардынатарка праграмы «Фонд дэмакратыі ў Беларусі» Германскага фонду Маршала ЗША **Аляўціна Снягір** распавяла пра дзейнасць праграмы. Паводле словаў спікеркі, падтрымка большай часткі праектаў не афішуецца, а многія з іх знаходзяцца ўнутры Беларусі (хоць больш за 50% – за мяжой). Снягір заклікала беларусаў і беларусак падаваць заяўкі на праграму малых і сярэдніх грантаў, якія накіраваны на розныя ініцыятывы па шырокім спектры тэмаў.



Служба хуткай гуманітарнай дапамогі. перайсці

Легалізацыя і дакументы. перайсці

Голас праз межы: Міжкантынентальная эстафета ў падтрымку Беларусі. перайсці

Праграма па рэабілітацыі рэпрэсаваных беларусаў. перайсці

Дапамога вызваленым палітвязням. перайсці

Адукацыя, культура, Беларусь? ...Мы? перайсці

